■ Кропка на карце

ЖЫВУЦЬ МАЛЫЯ КАМАРНІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Усё як у людзей, — смяецца Лідзія Іванаўна. — Дзеці вялікія, лятаць умеюць, а бацькі кормяць. Калі ўсе ў зборы і месца ў гняздзе малавата, старыя буслы пералятаюць на суседні хлеў пасядзець, а перавага на жылплошчу — у моладзі. Цікава за імі назіраць.

На ніжніх «паверхах» буслянкі прысуседзіліся вераб'і. Іх тут жыве многа. У іх наогул не жыццё, а казка. Перахапіць ежы заўсёды можна з курыных альбо гусіных кармушак Асіпукоў. Жытло высока, ніякі кот не дабярэцца. За ўсім гэтым птушыным кагалам любіць назіраць унук гаспадароў Лёша, які летнія канікулы часцей праводзіць у бабулі з дзедам.

Віктар Асіпук памяняў Брэст на родную вёску даўно. Калі ў 1990-я гады стала развальвацца буйная вытворчасць абласнога цэнтра (у прыватнасці, завод «Цветатрон», дзе ён працаваў), вырашыў вярнуцца ў бацькоўскі дом. Тым больш што маці засталася адна, пачала хварэць. Працаваць пайшоў у мясцовы калгас, займаўся і сваёй гаспадаркай. Жонка, адна з перадавых работніц панчошнага камбіната, ездзіла ў вёску на выхадныя, а пасля выхаду на пенсію перабралася канчаткова. Цяпер у Лідзіі Іванаўны і Віктара Мікалаевіча вялікі агарод, свой трактар, на падворку многа рознай жыўнасці. Куры, гусі, качкі жывуць ў добрым суседстве з паляўнічымі сабакамі, якіх у вальерах пяць, ды падрастае шосты шчанючок.

Паляванне — хобі гаспадара. Віктар Мікалаевіч можа гадзінамі расказваць розныя паляўнічыя гісторыі, а таксама пра асаблівасці паводзін ліса, кабана, зайца ў розную пару года. І становіцца зразумела, што паляванне — не толькі задавальненне аматара і міг удачы пры здабыванні трафея, а штодзённая карпатлівая праца. Сабак даглядаць, па-першае, каштуе грошай. А па-другое, іх неабходна пастаянна дрэсіраваць. Кожны дзень трэба ўставаць у пяць гадзін і арганізоўваць прабежку для сваіх гадаванцаў. Дрэсіроўка ж паляўнічага сабакі — таксама цэлая навука, якую ён спасцігае цягам жыцця. Лідзія Іванаўна захапленне мужа такоўна падтрымлівае, рэгулярна купляе свіныя ногі ды іншыя субпрадукты для сабак, гатуе корм. Тым больш што бацькава хобі перадалося сынам. Старэйшы жыве ў Брэсце, малодшы — у суседнім горадзе Высокае. А зімовыя выезды на паляванне становяцца своеасаблівым святам для ўсёй сям'і. Летам маці марынуе шчаўе, соліць агуркі, робіць прыпасы ўсяго, што асабліва любяць хлопцы пасля палявання. Цяпер бабулі ў яе кухонных клопатах дапамагае 10-гадовы ўнук Аляксей. Асаблівай радасцю для яго бывае, калі дзед дазваляе пасядзець на трактары.

Праз дзве хаты ад Асіпукоў жыве Настасся Бас, якая тры дзесяцігоддзі таму пераехала сюды са Столінскага раёна. І да пераезду, і пасля працавала даяркай — больш за сорак гадоў. «На ферме спраўлялася, яшчэ і дзялкі буракоў заўсёды брала», — згадвае жанчына. Як прывыкла працаваць з цямна да цямна, так і цяпер жыве, хоць гады не тыя і здароўе не тое. Расказвае, што старэйшы сын з нявесткай заўсёды ўшчуваюць маці: «Навошта табе столькі агародаў, такая гаспадарка? Трэба і пра сябе паклапаціцца». А ў яе ўсё справы: то шклопакеты замест старых вокнаў трэба было паставіць, то печы перарабіць, зараз вось і камін у доме з'явіўся. То фарбаваць-клеіць трэба наноў, як яна кажа, усё ж грошы робяць.

Старэйшым сынам Аляксандрам Настасся Уладзіміраўна асабліва ганарыцца. Сваёй працай, настойлівасцю, здольнасцямі выбіўся ў людзі. У школе ён старанна вучыўся. З дзяцінства захапляўся вайсковай рамантыкай, але бацькі на гэта асабліва не зважалі. І калі 17-гадовы хлопец раптам заявіў, што едзе ў Чалябінск паступаць у ваеннае вучылішча, для палескіх вяскоўцаў навіна стала шокам: «Дзе той Чалябінск?» А як маці заехала да сына на прысягу, то са слязьмі стала прасіць: «Паедзем дадому!», бо знайшла яго худога, зморанага трэніроўкамі, са сцёртымі да крыві ступакамі. Толькі сын нават слухаць не хацеў: ён жа быў на шляху да сваёй мары! Ён і цяпер, палкоўнік, камандзір дывізіі, сваім дзецям нярэдка кажа: «Калі чалавек нечага вельмі захоча — усё будзе пад сілу». І ужо сын Аляксандра Іванавіча, унук Настассі Бас, не спужаўся вайсковых цяжкасцяў, зрабіў выбар будучай прафесіі.

А Настасся Уладзіміраўна жыве з малодшым сынам, трактарыстам мясцовай гаспадаркі, і яго сям'ёй. Нярэдка яна забягае да суседкі Надзеі Максімаўны Кірылюк, якая мінулы год зімавала ў дзяцей у горадзе, а вясной зноў вярнулася ў родны дом. Некалі Надзея Максімаўна была перадавой даяркай і працай сваёй праславілася на ўсю ваколіцу. Цяпер здароўе падводзіць. Але свежае паветра і родныя сцены лечаць. У яе ці не самы прыгожы, дагледжаны дом і падворак на ўсёй вуліцы: дзеці стараюцца. Гаспадыні, вядома, прыемна тут жыць і чакаць, калі ў хату завітаюць родныя.

— У выхадныя дні пакупнікоў бывае больш, — кажа прадавец мясцовай крамы Іна Яфімава. Крама — гэта адзіны грамадскі і сацыяльны аб'ект на ўсё Коладна. Спрадвеку яна была на гэтай вуліцы, у былых Малых Камарніках. Працуе гандлёвае прадпрыемства праз дзень. Але людзі задаволены, усё неабходнае прывозяць, і вяскоўцам ёсць куды зайсці, перамовіцца словам. Асабліва зімой, асабліва адзінокім. Такім, як, напрыклад, 78-гадовы хутаранін, які заехаў па хлеб. Памацаў кішэні: грошы забыўся. «То я запішу бохан хлеба, іншым разам аддасце», — гаворыць прадавец. «Не, я паеду, прывязу», — крочыць да веласіпеда дзядуля. Яму, відавочна, лепш два разы зайсці ў магазін, чым адзін.

Іна Яфімава працуе даўно, усіх ведае. Пастаянна ў яе абслугоўваюцца чалавек 60, летам — больш. Вядома, у такой краме заробак невялікі, але прывыкла ўжо да гэтых людзей. Трэба ж некаму і тут працаваць.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Камянецкі раён

Прадавец Іна Яфімава.

Віктар Асіпук памяняў Брэст на родную вёску даўно. Калі ў 1990-я гады стала развальвацца буйная вытворчасць абласнога цэнтра (у прыватнасці, завод «Цветатрон», дзе ён працаваў), вырашыў вярнуцца ў бацькоўскі дом.

Самы юны жыхар былых Малых Камарнікаў Арцём Бас.

У яе ці не самы прыгожы, дагледжаны дом і падворак на ўсёй вуліцы: дзеці стараюцца. Гаспадыні, вядома, прыемна тут жыць і чакаць, калі ў хату завітаюць родныя.

Настасся Бас.

■ Здаровае харчаванне

З АГУРКАМІ НА ВАЧАХ

Здароваму харчаванню трэба вучыцца. Будзем рабіць гэта з дапамогай доктара медыцынскіх навук Элеаноры КАПІТОНАВАЙ (www.kapitonova.info).

Якую карыцу выбраць — у парашку ці ў палачках?

— Карыца вядомая людзям сотні гадоў. Быў час, калі за кілаграм карыцы давалі кілаграм золата. Цяпер карычневы парашок можна набыць у любым прадуктовым магазіне па даступным кошце. Многія гаспадыні любяць дадаваць карыцу ў розныя стравы — салодкія, мясныя, у дэсерты, пасыпаць карыцай запечаныя фрукты. Акрамя пікантнага смаку, карыца валодае шэрагам карысных вартасцяў, што робіць яе каштоўным для нашага арганізма.

Каб быць перакананым, што набываеш карыцу, а не падробку, лепш за ўсё набываць карычныя палачкі, а не молатую карыцу, куды нядобрасумленныя гандляры могуць падсыпаць розныя заменнікі — насенне карычневага дрэва, карычны экстракт і інш.

Сухары багатыя на клятчатку?

Клятчатка змяшчаецца ў абалонцы зерневых культур. Таму і ў хлебе (і, адпаведна, у сухарах) будзе столькі клятчаткі, колькі яе было ў муцэ, з якой хлеб выпякалі. Менш за ўсё — у пшанічным хлебе (і сухарах з яго), больш за ўсё — у жытнім з мукі грубага памолу (і ў жытніх сухарыках).

Як пазбавіцца ранішніх ацёкаў?

Калі з'яўляюцца ацёкі, неабходна абавязкова звярнуцца да ўрача, каб устанавіць прычыну іх з'яўлення. Нярэдка людзей непакояць ацёкі пад вачыма — тое, што называюць «мяхамі». Асабліва гэта актуальная праблема для жанчын, занепакоеных сваёй знешнасцю. Узнікненне «мяхоў» бывае звязана з рознымі прычынамі. І калі гэтыя ацёкі стойкія, то наведаць урача ўсё ж такі варта. Бо гэта могуць быць праблемы і з ныркамі, і запаленчыя змяненні ў прыдаткавых пазухах носа, і наяўнасць адэноідаў, і сардэчна-сасудзістыя захворванні, і іншыя прычыны.

Але часцей за ўсё з'яўленне «мяхоў» пад вачыма абумоўлена спадчыннымі асаблівасцямі будовы мышцаў, падскурна-тлушчавай клятчаткі, злучальнай тканкі, сасудзістых сплценняў вакол вочнага яблыка. У такіх выпадках «мяхі» прысутнічаюць заўсёды, толькі праяўленне іх бывае большым ці меншым, у залежнасці ад таго, што з'еў, колькі і чаго выпіў чалавек. Салёная, вострая ежа, алкаголь «патрабуюць» вялікай колькасці вады. Чалавек п'е шмат вадкасці, і як вынік — раніцай у люстэрка лепш не глядзець. Такога кшталту ацёчнасць павек і падвоччаў можна зменшыць, калі працерці гэтыя зоны кубікамі лёду або прыклаўшы на 7-10 хвілін ахалоджаныя пакецікі гатаванай гарбаты (лепш зялёнай). Падобным дзеяннем валодаюць тонкія лусты свежага гурка ці бульбы. Кубак моцнай натуральнай кавы раніцай таксама дапаможа ўбраць «лішнюю» ваду, паколькі кафеін валодае мачагонным эфектам. «Выганяюць» лішнюю ваду яблыкі і малочныя прадукты. Аднак лепшы спосаб папярэджвання падобных ацёкаў — не «грашыць» з ежай і выпіўкай.

Як часта варта набываць замест рафінаванага алею нерафінаваны?

У нерафінаваных алеях змяшчаецца багаты спектр ненасычаных тлустых кіслот, неабходных арганізму для нармальнага функцыянавання. Але нерафінаваныя алеі маюць спецыфічны смак і водар, які не кожнаму падабаецца. Для харчавання больш карысныя нерафінаваныя алеі, але для гатавання страў часта выкарыстоўваюць рафінаваныя, без смаку, каб не «перакрываць» смак стравы. Лепш за ўсё спалучаць гэтыя два віды алеяў: для гатавання «жывых» салатаў — нерафінаваныя, для смажання — ачышчаныя, рафінаваныя. Пры гэтым варта памятаць, што і адны, і другія патрабуюцца чалавеку ў вельмі невялікай колькасці — прыкладна 1 ст. л. у дзень.

Ці праўда, што вітаміны групы В працуюць на поўную магутнасць, толькі калі паступаюць у арганізм разам?

Вітаміны групы В — гэта 20 хімічных злучэнняў, якія сустракаюцца ў прыродзе толькі разам, маюць самастойнае біялагічнае значэнне, але пры «выкананні абавязкаў» у арганізме дапаўняюць адзін аднаго. Тым не менш, па розных прычынах можа назірацца дэфіцыт аднаго або некалькіх вітамінаў гэтай групы. Напрыклад, пры недахопе вітаміну B_6 могуць развівацца сутаргі, недахопе вітаміну B_{12} — злаякасная анемія і г.д.

«Групавы» характар дзейнасці вышэйзгаданых вітамінаў цалкам тлумачыцца біялагічнымі пазіцыямі, паколькі многія з удзельнікаў гэтай групы ўзаемазамяняльныя, некаторыя сінтэзуюцца ў арганізме кішачнай мікрафлорай, і таму дэфіцыт адразу ўсіх вітамінаў групы В можа быць толькі пры працяглым абсалютным галаданні. Часцей назіраецца недахоп пэўных вітамінаў гэтай групы, таму ў аптэчных полівітамінных прэпаратах мы бачым набор вітамінаў, дэфіцыт якіх найбольш верагодны.

Каб пазбегнуць гіпавітамінозу В, здароваму чалавеку неабходна ўжываць жытні хлеб з вотруб'ем, зерневыя шматкі, разнастайныя кашы, яйкі, сметанковае масла, мяса, печань, лісцевае зяленіва. Пры розных захворваннях, фізічных і псіхічных перагрузках, стрэсах патрэбнасць у вітамінах групы В павышаецца, таму ў такіх выпадках трэба карэкціраваць харчаванне прыёмам полівітамінаў з аптэкі (па рэкамендацыі ўрача).

Святлана БАРЫСЕНКА

Forbes падлічыў даходы Вікторыі Азаранкі

Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка ўвайшла ў пяцёрку самых высокааплатных спартсменак свету па версіі часопіса Forbes. Даход Азаранкі ацэньваецца ў $15,7 млн, уключаючы $6,7 млн прызавых і $9 млн ад спонсараў. Акрамя кантрактаў з буйнымі спартыўнымі брэндамі Nike і Wilson, беларуска з'яўляецца тварам японскай гадзіннікавай кампаніі Citizen, вядомага вытворцы энергетычнага напою Red Bull, фінансавай кампаніі American Express і іншых замежных прадпрыемстваў.

А першая ў гэтым рэйтынгу ўжо дзявяты год запар расійская тэнісістка Марыя Шарапава. Агульны даход спартсменкі з чэрвеня 2012-га па чэрвень 2013-га склаў $29 млн, з якіх $6 млн яна атрымала ў якасці прызавых (у тым ліку прадстаўніцкія выплаты за ўдзел у камерцыйных мерапрыемствах і іншыя бонусы), а $23 млн склалі выплаты па спонсарскіх кантрактах. Акрамя гэтага, узгадаем, летась Шарапава запусціла ўласны цукерачны брэнд, які з папулярнасцю гучнай бландзінкі абяцае прыносіць значныя дывідэнды. Усяго ж за сваю кар'еру на рэкламных пагадненнях Марыя зарабіла $180 млн, а сума яе прызавых набліжаецца да $27 млн. Гэта трэці вынік у гісторыі тэніса: спартыўныя дасягненні больш узбагацілі толькі амерыканскіх сясцёр Серэну і Венус Уільямс.

У тройцы лідараў таксама размясціліся тэнісісткі — Серэна Уільямс з даходам у $20,5 млн, уключаючы $8,5 млн прызавых і $12 млн ад спонсараў, і кітаянка На Лі з даходам у $18,2 млн ($3,2 млн. прызавых і $15 млн спонсарскіх выплат). Акрамя гэтых спартсменак, у першай дзясятцы прысутнічаюць яшчэ тры тэнісісткі — датчанка Каралін Вазняцкі, полька Агнешка Радваньска і сербка Ана Іванавіч — і толькі тры прадстаўніцы іншых відаў спорту (амерыканская аўтагоншчыца Даніка Патрык, паўднёвакарэйская фігурыстка Кім Ю На і амерыканская гальфістка Пола Крымер).

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

Хто прыдумаў тыя колы —
Каб яму без грошай жыць!
Хтосьці ў шубе, хтосьці голы,
Хтосьці едзе, хтось бяжыць...
Набываюць недарэмна
«Мерседэс», веласіпед,
Але ж надта непрыемна
У спякоту бегчы ўслед.
Грамадзяне, дайце слова,
Шчыра вам скажу, як свой:
— За прагрэс на ўсё гатовы,
Але — каб не пехатой!

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

«ПРУЖАНСКІ ПАЛАЦЫК» АДСВЯТКАВАЎ СВАЁ 20-ГОДДЗЕ

Адзін з самых цікавых музеяў Брэстчыны адсвяткаваў свой юбілей.

Помнік архітэктуры XIX стагоддзя — палац Швыкоўскіх быў рэстаўраваны на пачатку 1990-х. Ён стаў адным з першых адноўленых аб'ектаў культурнай спадчыны. Цяпер гэта краязнаўчы музей-сядзіба «Пружанскі палацык», які з'яўляецца сапраўдным упрыгажэннем райцэнтра. Яго супрацоўнікі вядуць вялікую краязнаўчую і асветніцкую работу. Паводле іх падлікаў, толькі на мерапрыемствах з нагоды 20-годдзя тут пабывала каля 800 гараджан і гасцей Пружанаў.

Да афіцыйнай вечарыны з нагоды юбілею прымеркавалі прэзентацыю манаграфіі Леаніда Несцерчука «Беларусь у вайне 1812 года паміж Напалеонам і Аляксандрам». Аўтар шмат цікавага расказаў пра вайну 1812-1814 гадоў. Тым больш што многія падзеі той кампаніі адбыліся на пружанскай зямлі.

Сапраўднай цікавінкай свята стала экспанаванне дзвюх загадкавых карцін. Музейныя работнікі іх ведаюць даўно. Паводле некаторых звестак, работы належаць пэндзлю Марка Шагала. Прыватны калекцыянер, які згадзіўся выставіць іх на адзін дзень, сам пажадаў застацца невядомым для шырокай публікі. Але ж і без гэтых твораў «палацыку» ёсць што паказаць. Музей мае звыш 6 тысяч экспанатаў. Напрыклад, выразаная з ліпы не пазней за 1601 год ікона «Тайная вячэра» з вёскі Варанілавічы. Спецыялісты кажуць, што такіх абразоў у Беларусі захавалася не больш за тры. А некалькі залаў музея дэманструюць экспанаты пад назвай «Рэчы з гарышчаў».

Яна СВЕТАВА.

РАСПАЧЫНАЕЦЦА СЕЗОН ПАЛЯВАННЯ НА ПТУШКУ

З 10 жніўня ў Беларусі адкрываецца сезон палявання на вадаплаўную і балотную дзічыну, а таксама на вальдшнэпа, вехіра, перапёлку і шызага галуба. Выключэнне складуць гусі: паляванне на іх адкрыецца праз месяц — з трэцяй суботы верасня.

— Паляваць на вышэйпералічыных птушыных, згодна з правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, можна ў светлы час сутак як зброевым, так і бяззброевым спосабам. Пры гэтым дазваляецца выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю і патроны са шротам, маламерныя судны без рухавіка ці з непрацуючым рухавіком, а таксама паляўнічых сабак усіх парод, акрамя ганчакоў і выжлаў. Пры бяззброевым спосабе палявання, які мае на ўвазе выкарыстанне лоўчых птушак, паляўнічаму неабходна мець пры сабе рэгістрацыйныя дакументы, а замежным грамадзянам — яшчэ і ветэрынарнае пасведчанне на жывёлу, — нагадала прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч.

Дзяржінспекцыя таксама звяртае ўвагу паляўнічых на неабходнасць захавання правілаў перасцярогі пры абыходжанні з агнястрэльнай паляўнічай зброяй, таму што большасць няшчасных выпадкаў падчас палявання адбываецца з-за неасцярожнага з ёй абыходжання і стральбы па няясных цэлях. Сезон палявання на вадаплаўную і балотную дзічыну будзе доўжыцца чатыры месяцы і закрыецца ў другую нядзелю снежня.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПЕРАЛІК БЕЗРЭЦЭПТУРНЫХ ЛЕКАЎ: ЦЯПЕР І ПА-АНГЛІЙСКУ...

У сувязі з правядзеннем чэмпіянату свету па хакеі ў Беларусі ў 2014 годзе Міністэрства аховы здароўя прапанавала аптэкам размясціць у гандлёвых залах дадатковую інфармацыю для наведвальнікаў на англійскай мове. Маецца на ўвазе пастанова Міністэрства аховы здароўя «Аб устанаўленні пераліку лекавых сродкаў, якія рэалізуюцца без рэцэпта ўрача» (яе тэкставая версія на англійскай мове), а таксама інфармацыя аб нумарах тэлефонаў і адрасах бліжэйшых аптэк і амбулаторна-паліклінічных арганізацый аховы здароўя.

Надзея НІКАЛАЕВА.

УДАРЫЎ ПАЛЯЎНІЦТВАЗНАЎЦУ, АДАБРАЎ ФОТААПАРАТ

Калі работнікам Стаўбцоўскай міжрайінспекцыі стала вядома пра незаконнае паляванне на тэрыторыі Дзяржынскага раёна паблізу вёскі Скарабагатаўшчына, дзяржінспектары тут жа выехалі на месца.

Там высветлілася, што паляўніцтвазнаўца Мінскага лясгаса, убачыўшы, як двое мужчын грузяць у аўтамабіль мяхі з мясам, сфатаграфаваў гэты працэс. Адзін з невядомых ударыў паляўніцтвазнаўцу і адабраў фотаапарат. Пасля мужчыны селі ў машыну, дзе іх чакалі жанчына і двое дзяцей, і з'ехалі.

— Пры абследаванні тэрыторыі, прылеглай да месца палявання, дзяржінспектары знайшлі яшчэ чатыры мяхі з мясам, шкуру і рэшткі тушы лася. Дзяржынскі РАУС завёў крымінальную справу. Падчас следства была ўстаноўлена асоба аднаго з парушальнікаў. Ім аказаўся жыхар Мінскага раёна, — распавяла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Пры вобыску ў яго канфіскаваны дзве паляўнічыя стрэльбы, газавы пісталет з боепрыпасам, а таксама легкавы аўтамабіль.

ВЫСЕК БЯРОЗЫ... У ВЁСЦЫ

Менавіта за такі ўчынак работнікамі Жлобінскай міжрайінспекцыі, Буда-Кашалёўскага РАУС і раённай пракуратуры падчас адпрацоўкі аператыўнай інфармацыі быў затрыманы жыхар вёскі Кленавіцы.

Грамадзянін незаконна ссек 118 бяроз. Дрэвы раслі на тэрыторыі названага населенага пункта. У дачыненні да парушальніка заведзена крымінальная справа за незаконную высечку дрэў, якая пацягнула нанясенне навакольнаму асяроддзю шкоды ў асабліва буйным памеры — 18,4 мільёна рублёў (184 базавыя велічыні).

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ЛЕЖАХОДЫ» НА ДАРОЗЕ

Нядаўна ў Быхаўскім раёне адбылося дарожнае здарэнне, у выніку якога загінуў 25-гадовы пешаход. Дакладней яго трэба назваць «лежаходам», таму што ён спаў там жа, на дарозе. Прычына, як высветлілася, — алкагольнае ап'яненне. Вадзіцель «Аўдзі», якому толькі 21 год, з'ехаў з месца аварыі, але яго затрымалі ў тую ж ноч, і яму давядзецца адказваць за свой учынак.

Аднак трэба адзначыць, што наезды на людзей, якія ляжаць на дарозе, зусім не адзінкавыя. Звычайна, расказваюць у ДАІ, такія выпадкі адбываюцца ў цёмны час сутак, а ляжачыя людзі не адзначаны святлоадбівальнымі элементамі. Напрыклад, цяпер следству трэба ўстанавіць, з якой прычыны ў Бабруйскім раёне паблізу вёскі Спорнае на дарозе ляжаў састарэлы мужчына, які загінуў у выніку аўтанаезду.

— Бестурботнасць на дарозе прыводзіць да цяжкіх наступстваў, — каментуе інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе Магілёўскай ДАІ Таццяна Старасотнікава. — Як правіла, спіртныя напоі ўжываюцца ў кампаніі сяброў, сваякоў, знаёмых людзей. У такіх выпадках жыццёва важна паўплываць на чалавека, каб ён не сеў за руль нецвярозым, каб не пайшоў дадому пешшу па дарозе і не паставіў пад пагрозу чалавечае жыццё, сваё і чужое.

Ілона ІВАНОВА.